**“Беларускія кірылічныя выданні ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі” (2011–2012 гг.)**

Мэта даследавання – комплекснае вывучэнне і ўвядзенне ў навуковы ўжытак калекцыі беларускіх кірылічных выданняў, якая захоўваецца ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Вынікам навуковай работы стала стварэнне ў рамках электроннага каталога Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі калекцыі бібліяграфічных запісаў “Кірыліца – беларускія выданні” і электроннай бібліятэкі лічбавых копій беларускіх кірылічных выданняў. За 2011–2012 гг. праведзена рэдакцыя 282 бібліяграфічных апісанняў кірылічных выданняў у электронным каталозе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, апісаны і праіндэксаваны ў фармаце BELMARC новыя паступленні кірылічных выданняў, набытыя і падораныя бібліятэцы, у тым ліку магілёўскае выданне з гравюрамі “Жыцці святых” Дзімітрыя Растоўскага 1702 г. (кніга набыта на сродкі ААТ “Кандытарская фабрыка «Слодыч»”). Навуковая праца з калекцыяй беларускіх кірылічных выданняў працягваецца, калекцыя сістэматычна папаўняецца шляхам закупкі рэдкіх і старадрукаваных кніг.